о цене жизни хотя бы для одного из солдат, старшие по званию часто принимали решение, не согласующееся с логикой боевых действий, но оправданное с гуманных позиций.

Самой трудной задачей для каждого командира была доставка родным, по афганской терминологии, «груза 200» – гроба с телом погибшего воина. Прежде всего, страшным ударом была потеря бойца из личного состава для самого руководителя, который не мог найти никаких оправдательных слов для самого себя, не говоря уже о том, что требовалось определенное мужество в утешении родных и близких.

Взыскательное отношение к себе не могло избавить от мыслей, что не все было сделано для того, чтобы кого-то спасти. Но война есть война. Смерть одного из братьев (а по духу они все были братьями) ни для кого не была напрасной, а являлась закономерным итогом духовного подвига бойца. Так, по мысли, В. Н. Николаева *«Смерть – это Божий дар. Как и рождение. Это логический итог нашего земного существования»* [2, с. 8].

В самом начале Евангелия мы читаем: «*Уже и секира при корне дерев лежит: всякое дерево, не приносящее доброго плода, срубают и бросают в огонь*» (Матф. 3:10). В структуре евангельского текста этот стих будет дублироваться не один раз, по всей видимости, с той целью, чтобы к человеку пришло осознание своего служения Богу и ближним, своего высшего предназначения на Земле.

**Заключение.** В художественно-документальных очерках А. Чайки мы находим подтверждение мысли о важности действенной и спасительной любви. Духовный опыт воинов-интернационалистов свидетельствует о христианском отношении героев к миру и человеку.

В нашей статье мы не ставили задачу оправдать политические цели и мотивы афганской войны, а попытались показать высокий смысл жизни героев, реальных участников вооруженного конфликта в Афганистане.

1. Зданюк, В. В. Я штурмовал дворец Амина : армия без грифа «секретно» / В. В. Зданюк. – Мн. : Беларусь, 1992. – 176 с.
2. Николаев, В. Н. Живый в помощи : документальная повесть в 2-х частях / В. Н. Николаев. – М. : Софт Издат, 2006. – 320 с.
3. Евангелие. – М. : Благовест, 2011. – 608 с.
4. Чайка, А. Ф. Среди афганских гор : докум. повести / А. Ф. Чайка. – Мн. : Беларусь, 1989. – 191 с.

## АСАБЛІВАСЦІ ІНДЫВІДУАЛЬНАГА СТЫЛЮ СУЧАСНАГА БЕЛАРУСКАГА ПРАЗАІКА У. ГНІЛАМЁДАВА

*В.І. Русілка*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Выдатны беларускі літаратуразнаўца, доктар філалагічных навук, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, аўтар звыш 30 манаграфій і кніг і каля 1000 літаратуразнаўчых работ, У.В. Гніламёдаў з пачатку ХХІ стагоддзя надзвычай актыўна выяўляе свой талент ў галіне мастацкай прозы, што надае асаблівую *актуальнасць* даследаванням, у якіх асэнсоўваецца яго ўклад у сучасны літаратурны працэс. Проза У. Гніламёдава дае багаты фактычны матэрыял для разумення найноўшых тэндэнцый у развіцці эпічных жанраў і магчымасцей класічнага рамана.

Мэта дадзенай работы – асэнсаванне мастацкай спецыфікі прозы У. Гніламёдава ў кантэксце сучаснага літаратурнага працэсу, сістэматызацыя мастацкіх прыёмаў стварэння маштабных эпічных твораў і эстэтычна пераканальных вобразаў-персанажаў.

**Матэрыял і метады.** Аб'ектам даследавання ў артыкуле сталі раманы У. Гніламёдава, прысвечаныя асэнсаванню асноўных падзей і трагедый ХХ стагоддзя праз лёс сям'і Лявона Кужаля. У навуковым аналізе выкарыстаны прыёмы канкрэтна-гістарычнага, кампаратыўнага і дэскрыптыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Раманная эпапея У. Гніламёдава, у якой на шырокім гістарычным фоне паказваецца лёс простага чалавека і адначасова з гэтым удумліва і пераканальна раскрываецца гісторыя беларускага народа, даецца маштабная панарама ХХ стагоддзя, налічвае ўжо сем твораў: "Уліс з Прускі" (2006), "Расія" (2007), "Вяртанне" (2008), "Валошкі на мяжы" (2011), "Вайна" (2014), "Пасля вайны"(2015), "Праўда жыве пасярэдзіне" (2019). Апошні з пералічаных раманаў яшчэ не закончаны, яго заключныя раздзелы здадзены ў друк у часопіс "Полымя".

Репозиторий ВГУ

З'яўленне цыкла гістарычных раманаў У. Гніламёдава стала годным адказам на заканамернае пытанне пра наяўнасць у сучаснай беларускай літаратуры твораў, якія можна было б паставіць у адзін шэраг з неаспрэчнай класікай – раманамі Я. Коласа, К. Чорнага, І. Мележа. Гэтую думку можна падмацаваць спасылкамі на актыўнае асэнсаванне і аднадушна высокую ацэнку твораў пісьменніка ў перыядычным друку (грунтоўныя даследаванні В. Локун, Я. Гарадніцкага, В. Жураўлёва, М. Мішчанчука, З. Драздовай, Т. Студзенка, І. Шаладонава, А. Раманчука, Г. Навасельцавай, інтэрв'ю з пісьменікам М. Мікуліча, В. Паклонскай, У. Давыдава і інш.). Справа ў маштабнасці задачы, якую паставіў перад сабой аўтар: стварыць у раманах гісторыю беларускага народа праз гісторыю сваёй сям'і, увасобіць ў мастацкіх вобразах тыпы нацыянальнага характару беларусаў, паказаць, як гаворыць сам У. Гніламёдаў, "чалавека ХХ стагоддзя, ці, дакладней, чалавека ў плыні часу мінулага стагоддзя" "[1, с. 4]. Справа і ў тым, што вырашэнне гэтай звышскладанай задачы, атрымалася сапраўды высокамастацкім, таленавітым і цікавым для чытача.

У раманах праўдзіва і пераканальна адлюстраваны духоўныя асновы характару Лявона Кужаля – селяніна з заходнебеларускай вёскі Пруска, які прайшоў праз многія выпрабаванні: нялёгкая праца наёмнага рабочага за мяжой, у Амерыцы, вяртанне, трагічныя падзеі Першай сусветнай вайны, рэвалюцыі, калектывізацыі, Вялікай Айчыннай вайны, цяжкасці пасляваеннага жыцця. Многія з фактаў, адлюстраваных У. Гніламёдавым, у беларускай літаратуры амаль не ўзнімаліся, а тым болей у такім разгорнутым і грунтоўным асвятленні, на аснове цытавання шматлікіх гістарычных дакументаў, што ўзмацняе эфект сапраўднасці.

Галоўны герой цыкла гістарычных раманаў Лявон Кужаль, прататыпам якога стаў дзед пісьменніка Лявонцій Сцепанюк, – яркі тып беларуса з яго працавітасцю, цярплівасцю, трываласцю перакананняў, нясхільнасцю да рэвалюцыйных перамен. Гэты вобраз увасабляе галоўную ідэйную ўстаноўку аўтара – погляд на гісторыю з пункту гледжання беларуса-селяніна, асэнсаванне зямлі і працы на ёй як асновы чалавечага жыцця. І ў гэтым сэнсе вобраз Лявона Кужаля, безумоўна нацыянальны архетып, які стаіць упоравень з героямі беларускай класічнай літаратуры – Міхалам з паэмы Я.Коласа "Новая зямля" і Васілём Дзятлам з "Палескай хронікі" І. Мележа. Паказваючы галоўны персанаж у храналагічным развіцці праз дзесяцігоддзі, аўтар выкарыстоўвае адметныя прыёмы стварэння вобраза: псіхааналіз, унутраныя маналогі, рэфлексія, няўласна-простая мова, філасофскі роздум, здольнасць да ўчынкаў, якія могуць быць не прынятыя нават блізкімі людзьмі (каханне да замужняй жанчыны, выхаванне чужога дзіцяці).

У раманах побач з галоўным вобразам з'яўляюцца не менш важныя вобразы-персанажы нашчадкаў Лявона Кужаля: сына Васіля і ўнука Валодзіка. Дзеля іх жыве Лявон, і тое, што яны родныя не па крыві, а па лёсе, па жыцці, робіць герояў яшчэ болей высакароднымі і пераканальнымі.

Маштабныя эпічныя характары ў раманах У. Гніламёдава створаны на высокім ідэйна-эстэтычным ўзроўні. Арыентуючыся на класічную эпічную традыцыю, пісьменнік узбагачае яе сучаснымі прыёмамі апавядальнай паэтыкі. Так, будуючы сюжэт, аўтар выкарыстоўвае, побач з традыцыйным лінейным апавяданнем, прыёмы вяртання, забягання наперад, загадкі, "шахматнага" размяшчэння фабульнага часу, вядзе нарацыю ад імя розных асоб (у тым ліку і праз дзённікі, ліставанні). Гэта, безумоўна, ажыўляе чытацкую ўвагу. Увядзенне аўтарскіх развагі, цытаванне гістарычных дакументаў, апісанне побыту ўдала спалучаецца з дынамічнымі, лёгкімі, неабцяжаранымі аўтарскай мовай дыялогамі. Асаблівым майстэрствам вызначаюцца адпаведныя аўтарскай ідэйнай установцы паэтычныя пейзажы, насычаныя вобразна-выяўленчымі сродкамі і мясцовай канкрэтыкай.

У сістэме выдатных вобразаў-персанажаў і героі, і другарадныя, і дапаможныя, і нават выпадковыя персанажы падаюцца праз разнастайныя спосабы экспазіцыі і характарыстыкі (у прыватнасці, праз яркія дэталі партрэту, моўную індывідуалізацыю, унутраныя маналогі). Як адзначалі крытыкі, адзін з самых яркіх вобразаў – вясковы дзівак-вандроўнік Кузёмка, "скрынка з чуткамі і навінамі". Гэта адметны нацыянальны характар, што падкрэсліваецца каларытнымі партрэтнымі дэталямі: "чалавек у бравэрцы, на галаве – магерка, нагавіцы запраўлены ў боты з зіхоткімі халявамі"[2, с.76].

Мастацкай пераканальнасцю вызначаецца вобраз жонкі Лявона, рускай жанчыны Фёклы Платонавай, якая змагла арганічна ўвайсці ў новае для яе беларускае асяроддзе, – тып моцнага жаночага характару, у якім падкрэсліваецца здольнасць кахаць і мяняць жыццё ў імя кахання,

Репозиторий ВГУ

справядлівасць, мацярынская чуласць і спагадлівасць да людзей. Праз гэты вобраз сцвярджаецца і важная для У. Гніламёдава ідэя славянскага адзінства.

У новым рамане на першы план выходзіць аўтабіяграфічны вобраз Валодзі Платонава – тыповага для Беларусі 50-х гадоў маладога інтэлігента, наіўнага, чыстага душой, захопленага навукай. Гэты твор мае адзнакі прыватнай хронікі з выразным лірычным кампанентам.

У прозе У. Гніламёдава з дапамогай разнастайных мастацкіх прыёмаў створаны яркія тыпы нацыянальнага характару беларусаў, якія дапамагаюць лепш зразумець заканамернасці нацыянальнай гісторыі і перспектывы далейшага развіцця беларускага грамадства.

У выніку даследавання цыкла гістарычных раманаў можна вылучыць наступныя асаблівасці індывідуальнага мастацкага стылю У. Гніламёдава:

1) маштабнае эпічнае асэнсаванне лёсавызначальных гістарычных падзей XX стагоддзя праз жыццё канкрэтнай сялянскай сям'і;

2) стварэнне пераканальных беларускіх нацыянальных характараў, для чаго выкарыстаны разнастайныя прыёмы стварэння вобраза-персанажа;

3) майстэрства пабудовы сюжэту і выкарыстанне шматлікіх прыёмаў падтрымання чытацкай зацікаўленасці;

4) жанравая разнастайнасць твораў (розныя творы маюць адзнакі рамана-падарожжа, рамана-хронікі, сацыяльна-бытавога рамана і нават дэтэктыву);

5) шырокае выкарыстанне і цытаванне ў мастацкіх творах (асабліва ў рамане “Расія”) гістарычных дакументаў;

6) моўнае майстэрства апавядальніка, які шырока і дарэчна выкарыстоўвае дыялектызмы, іншамоўную лексіку, індывідуалізацыю мовы персанажаў;

7) аўтабіяграфізм твораў.

**Заключэнне.** У. Гніламёдаў – яркая мастацкая індывідуальнасць, якая займае вядучае месца ў сучасным літаратурным працэсе. У яго раманах знайшла высокамастацкае ўвасабленне адна з вядучых тэндэнцый сённяшняй прозы – імкненне да маштабнага эпічнага ўвасаблення народнага жыцця.

1. Гніламёдаў, У. Уліс трапіць у Расію / У. Гніламёдаў // Літаратура і мастацтва. – 2007. – 19 кастр. – С. 4
2. Гніламёдаў, У. Вяртанне / У. Гніламедаў // Мінск: Мастацкая літаратура, 2008. – 429 с.

## СТРУКТУРНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ПРОСТЫХ МІКРАТАПОНІМАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ

*Г.К. Семянькова*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

На сённяшні дзень мовазнаўцы говораць пра неабходнасць больш глыбокага вывучэння тапаніміі (і мікратапаніміі ў тым ліку) рэгіёнаў Беларусі. Праблемы рэгіянальнай мікратапанімікі застаюцца пакуль што недастаткова распрацаванымі: у прыватнасці, няма спецыяльнага даследавання, прысвечанага дэталёваму разгляду мікратапаніміі Віцебскай вобласці. Пытанне патрабуе ўвагі яшчэ і таму, што ў мікратапонімах адлюстроўваюцца не толькі моўныя рысы людзей, але і факты гісторыі народа, асаблівасці жыццёвага ўкладу і светаўспрымання беларусаў, іх творчыя здольнасці. Па прычыне бытавання ў вуснай мове, адсутнасці кадыфікацыі мікратапанімны матэрыял з цягам часу бясследна знікае, таму сабраць і захаваць яго – надзвычай важная задача. У сувязі са сказаным *актуальнасць* прапанаванага артыкула ўяўляецца нам відавочнай.

Мэта артыкула – выяўленне і апісанне асаблівасцяў структуры простых мікратапонімаў Віцебшчыны.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужылі прыклады (агульная колькасць – больш за 150 адзінак), сабраныя ў 2008-2020 гг. на тэрыторыі Віцебскага, Аршанскага, Глыбоцкага раёнаў Віцебскай вобласці шляхам апытання мясцовых сельскіх жыхароў. Выкарыстаны апісальны *метад* даследавання.

Сельская мікратапанімія ў якасці аб'екта даследавання абрана не выпадкова, бо яна ў значнай ступені больш багатая і кансерватыўная, чым гарадская. Так, у сельскай мікратапаніміі прадстаўлены розныя класы аб'ектаў (мікрагідронімы, мікраааронімы і інш.), а гарадскую



Репозиторий ВГУ